# Лідзія Мікалаеўна Аланцьева




Лідзія Мікалаеўна нарадзілася 5 верасня 1919 года у Оршы. Там скончыла педагагічны тэхнікум. Асабісты жыццяпіс пачынае з трагічнай даты 25 чэрвеня 1941 года, калі адбыўся першы авіяцыйны налёт на горад. Назаўсёды ў памяці засталіся роў бамбардзіроўшчыкаў, выбухі, пажары, натоўпы бежанцаў. Горад раптоўна стаў прыфрантавым. Людзі ратаваліся як маглі.

Паход не быў спакойным: бежанцаў суправаджалі варожыя самалёты. Калі яны набліжаліся, людзі хаваліся ў прыбярэжных кустах. Савецкія войскі адступалі імкліва.

Калі фронт пракаціўся на ўсход, бежанцы вярнуліся ў Оршу.

Горад было не пазнаць, засталіся адны рускія печы. Астатняе ўсё разбамбілі.

Жыць няма дзе, есці няма чаго. Туліліся ў ацалелым жыллі, разам з пяццю іншымі сем'ямі спалі побач на падлозе. Потым пачалі капаць зямлянкі.

З 1946 па 1951 год дзяўчына працавала ў пасляваенным галодным Аляксандраўскім дзіцячым доме Міёрскага раёна. Пасля адкрыцця ў Міёрах першага дзіцячага садка, дзе была адна група, перайшла працаваць выхавацелем ў садок. З яго праз 37 гадоў і выйшла на заслужаны адпачынак. Усё жыццё Лідзія Мікалаеўна прысвяціла дзецям.

5 верасня 2019 родныя і блізкія, быўшыя выхаванцы, калегі, грамадскасць раёна адзначылі сто гадоў дарагога чалавека. Праз год яе жыццёвы шлях завяршыуся, але памяць пра гэтага шаноунага доугажыхара застанецца у сэрцах міярчан назаусёды.